# Модусы духоўнай арыентацыі герояў прозы Якуба Коласа 20-х гадоў

Першая спроба вызначэння модусаў духоўнай арыентацыі герояў у сучаснай беларускай “малой” прозе была зроблена І.М. Шаладонавым. Даследчык зазначае, што бываюць гістарычныя перыяды жыцця, якія міжволі вымушаюць чалавека і найбольш творцу, пісьменніка сфакусіраваць свой позірк найперш на самім сабе, на вызначэнні сваёй прысутнасці ў сучасным свеце. Выкарыстанне паняцця “модус духоўнай арыентацыі герояў” дапаможа нам размежаваць персанажаў прозы Я.Коласа па групах паводле іх маральна-этычных арыенціраў.

Якуб Колас прыйшоў у беларускую літаратуру як выразнік сацыяльных і нацыянальных спадзяванняў беларускага народа. У сваёй творчасці ён адлюстроўваў барацьбу народа за лепшую будучыню ў часы царызму, перамогу яго ў суровыя дні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Але ўводзячы ў літаратуру факты, якія ён назіраў збоку, Колас ацэньваў іх не з пункту погляду “пралетарскай ідэалогіі”, а з агульнагуманістычных пазіцый. Рэвалюцыю празаік асэнсоўвае як з’яву, якая закранае кожнага чалавека. “Захоўвачы выразную класавую зарыентаванасць у распрацоўцы характараў, надаючы ўчынкам дзеючых асоб адпаведную ідэалагічную матывацыю, пісьменнік, тым не меньш, далёкі ад катэгарычнасці, прасталінейнасці ў вырашэнні канфлікту, у раскрыцці псіхалогіі паводзін сваіх герояў” [2, с. 61].

Як пісьменнік-рэаліст Якуб Колас стварыў цэлую галерэю людскіх тыпаў з жыцця пасляравалюцыйнага грамадства. Ён адзін з першых у беларускай літаратуры стварыў вобраз камуніста-ўдзельніка грамадзянскай вайны, якім пачаў распрацоўку характару актыўна дзейнаснага, грамадскага героя (“Сяргей Карага”), таксама выявіў тып перадавых прадстаўнікоў сялянства, носьбітаў новай свядомасці (“Дачакаўся”). Сістэму станоўчых герояў Колас дапоўніў рэалістычнымі антыгероямі, стварыўшы тып чалавека-носьбіта дэфармаванай свядомасці (“Балаховец”), вобразы пошлых мяшчан, якія жывуць дробязнымі інтарэсамі (“У двары пана Тарбецкага”, “Хатка над балотцам”). Колас-празаік з адмоўнага боку паказаў прадстаўнікоў новай ўлады, стварыўшы тып жорсткіх і грубых чыноўнікаў (“Хаім Рыбс”), таксама “былых людзей”, якія сталі “саўслужамі” (“Пракурор”), чакаюць звароту мінулых парадкаў (“Царскія грошы”), з настаўнікаў пераходзяць у царкоўны сан (“Курская анамалія”) і г.д.

Галоўнае, што вызначае прыроду і накіраванасць творчасці Якуба Коласа 20-х гадоў, з’яўляецца пафас сцвярджэння савецкіх форм жыцця і сацыялістычных ідэалаў. У апавяданні “Сяргей Карага” пісьменнік імкнецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсвядоміць ролю камуністычнай партыі ў рэвалюцыі і грамадзянскай вайне.

Коласаўскі герой Сяргей Карага значна адрозніваецца ад тых “жалезабетонных” бальшавікоў, створаных пісьменнікамі ў першыя гады рэвалюцыі. Празаік глыбока і шматбакова паказвае свайго героя, яго ўнутраны свет, думкі і перажыванні, паралельна раскрываючы яго мінулае жыццё з мэтай матывацыі і псіхалагічнага апраўдання заключнага акорда яго паводзін – гераічнай смерці, якая сімвалізуе веліч і непераможнасць бальшавіцкіх ідэй.

Вобраз Сяргея Карагі ўвасабляе новую асобу, народжаную ў рэвалюцыйнай барацьбе, чалавека з новым светаўспрыманнем, валявога, энергічнага, добра разумеючага правату сваёй справы. Загартаваны ў рэвалюцыі, Сяргей Карага мужна аддае ей сваё жыццё, шкадуючы толькі аб адным: “Яму незвычайна моцна хацелася жыць, хацелася быць сведкам тых вынікаў жыцця, якія прынясуць з сабою камунізм, і тых форм новага будаўніцтва, у якія выльецца гэтае жыццё. Дый само па сабе гэтае жыццё такое цікавае. А ён, па праўдзе сказаць, яшчэ і не жыў. То бадзянні па астрогах у царскія часы, то работа ў падполлі, то гэтая вайна… Ніколі раней не думаў ён аб смерці, а вось цяпер яна ўспомнілася” [1, с. 65]. Пісьменнік гэтым падкрэслівае, што рэвалюцыйная свядомасць героя была сфармаванна яшчэ задоўга да падзей грамадзянскай вайны.

Крытыкуючы сялянскую абмежаваннасць у цэлым, Колас у апавяданні “Дачакаўся” стварыў станоўчы вобраз селяніна-бядняка Пятра Мазалеўскага, які шчыра вітае рэвалюцыю, бо “яна паланіла, захапляла яго веліччу і хараством ідэі, калі людзі будуць мець роўнае права на дабрабыт, калі не будзе гэтага абірання чалавекам чалавека і знікне гэтае векавечнае прыгнечанне багатым беднага” [1, с. 76]. Ён адзіны ў вёсцы разумее сапраўдную, гуманную сутнасць новай улады ў параўнанні з царскай. Але ніхто з аднавяскоўцаў яго не падтрымлівае, што выклікае ў яго душы горыч і крыўду.

Глыбока разумеючы, наколькі працягла і складана адбываліся змены ў свядомасці чалавека новага часу, пісьменнік стварае шэраг твораў, у якіх даследуе страту маральных арыенціраў, прыстасавальніцтва людзей да зменлівых умоў жыцця. “Як мастак-псіхолаг Колас канстатаваў факт трагічнага сімбіёзу-феномену “псіхалогіі” нізкіх матываў з феноменам “ідэалогіі” выхалашчаных гуманістычных мэт. У свядомасці людзей старыя звычкі маюць моцныя карані псіхафізічнай устойлівасці, і калі адна з ідэалогій напорыста змяняе іншую, чалавеку бывае не пад сілу хутка змяніць сябе і сваю прыроду. І тады ў яго характары часам адбываюцца трагічныя працэссы адмаўлення ад свайго “я”, імітацыі, прыстасавання, хаця чалавек

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

быццам бы і захоўвае ўсе папярэднія жыццёвыя ўяўленні. Працэс чалавечай мімікрыі ці супраціўленне ёй, калі новы сімбіёз свядомасці паступова стане вызначаць дамінантную асаблівасць менталітэту цэлага пакалення, становіцца і асновай даследавання зменлівых рэалій жыцця ў творчасці Я.Коласа” [3, с. 119].

У апавяданні “Хаім Рыбс” цэнтральнай з’яўляецца праблема ўзаемаадносін улады і асобы. Празаік паслядоўна і грунтоўна даследуе псіхалогію супрацьстаяння грубых і цынічных чыноўнікаў, якія дыскрэдытуюць новую ўладу і старога крамніка Хаіма Рыбса, чалавека высокасумленнага, прынцыповага, з высокім пачуццём чалавечай годнасці. Колас-гуманіст са спачуваннем раскрывае трагедыю “маленькага” чалавека, які вырашыў адзін супрацьстаяць вялікай бюракратычнай машыне, не прымаць новую пасаду квартальнага, на якую яго бралі завочна. З іроніяй і сарказмам ён разважае: “Цяпер брат, так: сягоння ты квартальны, заўтра – загадчык прадкома, пазаўтра – ляскома, а там – невядома… Часы, брат, такія… Нічога, брат, паслужы! [1, с. 36]. Аўтар падкрэслівае некампетэнтнасць і абмежаваннасць прадстаўнікоў новай улады, якія адштурхоўвалі ад сябе людзей, прымушалі многіх прыстасоўвацца да заганнай сістэмы кіравання гаспадаркай і людзьмі.

Такім чынам, у творах 20-х гадоў пісьменнік “пераконвае свайго чытача ў тым, што трэба жыць па справядлівасці, што праўда можа перамагчы крыўду, а крыўда і зло заўсёды выклікаюць новае зло. На яго думку, толькі абапіраючыся на адвечныя нормы народнай маралі і этыкі, іх прагрэсіўны і глыбока гуманны сэнс можна будзе разлічваць на захаванне справядлівасці, праўды, чалавечнасці на ўсіх крутых паваротах гісторыі” [3, с. 121].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура:

1. Колас, Я. Збор твораў: У 14 т-х, Т. 5 / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1973. – 640 с.
2. Навойчык, П. І. Духоўны свет героя ў апавяданнях Я. Коласа 20 – 30-х гадоў / П.І. Навойчык // Матэрыялы нав. канферэнцыі “Спадчына Якуба Коласа – мастака, вучонага, дзеяча культуры і яе сучанае асэнсаванне. – Мінск: ВПП імя Я. Коласа, 2000. – С. 61 – 65.
3. Шаладонаў, І. Выпрабанне на чалавечнасць (паводле апавяданняў Якуба Коласа 1920-х гадоў) / І. Шаладонаў // Полымя. – 2007. - №11. – С. 118 – 126.